**Сутула, Г.** Службу салдаты не пакідаюць: ці ў вечнасць ідуць, ці ў запас / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. — 2020. — 15 лют. — С. 4.

## СЛУЖБУ САЛДАТЫ НЕ ПАКІДАЮЦЬ: ЦІ Ў ВЕЧНАСЦЬ ІДУЦЬ, ЦІ Ў ЗАПАС

*У маі 1979 года пагранічнікі першыя ступілі на афганскую зямлю і апошнія, пасля вываду войск, пакінулі тэрыторыю, палітую крывёй саслужыўцаў. За 10 гадоў вайны ў баявых дзеяннях на тэрыторыі Афганістана прынялі ўдзел больш за 62 тысячы савецкіх пагранічнікаў, якія правялі 1113 ваенных аперацый, знішчылі 41 тысячу 216 баевікоў. Больш за 22 тысячы ваеннаслужачых атрымалі ўзнагароды за праяўленую мужнасць. Сем з іх былі ўдастоены вышэйшых дзяржаўных адзнак – званняў «Герояў Савецкага Саюза». У апошнім дазоры назаўсёды засталіся 514 пагранічнікаў. За ўвесь час баявых дзеянняў ніводзін пагранічнік не трапіў у палон і не прапаў без вестак.*

### ДАЛЕЙ ЗА ТЭРМЕЗАМ – ЧУЖАЯ ЗЯМЛЯ

Тэрмез – цэнтр Сурхандар'інскай вобласці, самая паўднёвая кропка Узбекістана, а яшчэ – гэта «змрочная абсалютнасць, дзе пачынаецца чужая зямля, якую можна пакарыць, але нельга прыручыць». Назва горада поўнасцю адпавядае перакладу «душны»: летам тэмпература там падымаецца да +50 градусаў, зімой не апускаецца ніжэй +38.

Ад вёскі Забалаць Гродзенскай вобласці да Тэрмеза – пяць тысяч кіламетраў «з хвосцікам». Менавіта туды падчас восеньскага прызыву 1985 года трапіў беларус Андрэй Латушка.

Хлопец рос у шматдзетнай сям'і: у яго былі чатыры сястры і два браты. Скончыўшы Забалацкую СШ, паступіў у Гродзенскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 7 на аўтакранаўшчыка. Там жа вывучыўся на вадзіцеля – наблізіў да рэальнасці дзіцячую мару: хацеў служыць у арміі ў аўтамабільных войсках. Жаданне ўзнікпа пасля расказаў старэйшага брата Федзі, які служыў у аўтароце ў Тындзе Амурскай вобласці, будаваў Байкала-Амурскую магістраль.

Засмуціўся, калі сказалі, што яго бяруць на тры гады ў марфлот, але лёс, як кажуць, не абыдзеш: «купцы» з мараходства не прыехалі, і Андрэй трапіў у сухапутныя войскі.

– З Гродна даехалі да Масквы, затым пераселі на цягнік да Ташкента, адтуль дабраліся да Тэрмеза. Гэта была тэрыторыя распалажэння аператыўнага аб'яднання пагранічных войск КДБ СССР Чырвонасцяжнай Сярэднеазіяцкай пагранічнай акругі. У Тэрмезе і пачалася мая вучэбка. Тры месяцы ваеннай падрыхтоўкі завяршыліся і ў сакавіку 1986 года нас ужо размяркоўвалі па месцах праходжання тэрміновай службы, – расказвае Андрэй Сцяпанавіч.

Але перш чым трапіць у аўта-роту хлопцу прыйшлося прайсці некалькі выпрабаванняў. Напачатку была прапанова ехаць у Душанбэ на курсы павароў. Сытае жыццё яго не спакусіла: з дзесяці нававбранцаў застацца пры кухні адмовіўся толькі радавы Латушка. Не прамяняў ён руль і на курсы падрыхтоўкі кінолагаў, якія працавалі з сабакамі, навучанымі браць след, шукаць міны і наркотыкі. І пазней, праз год службы, адмовіўся ад звання, застаўся радавым, затое ў кабіне свайго аўтамабіля. Праўда, у той кабіне нельга было схавацца ні ад куль, ні ад мін душманаў.

### 730 ТРЫВОЖНЫХ ДЗЁН І НАЧЭЙ

– Наш узвод падвоза дастаўляў групы дэсантнікаў-штурмавікоў на верталётныя пляцоўкі. Акрамя гэтага, вясной і восенню, калі была крыху меншая, чым летам, спёка, мы дастаўлялі грузы – дровы, вугаль, бензін, абмундзіраванне, зброю, лекі, харчаванне – чатыром мотаманеўровым групам, якія размяшчаліся на тым баку афганскай мяжы. Першы мой выезд у калоне быў у красавіку 1986 года, і я яго ніколі не забуду. 60 гружаных аўтамабіляў ланцужком, трымаючы дыстанцыю і не збочваючы з наезджанай каляіны, адправіліся ў кішлак Мармоль. Наперадзе сапёры з сабакамі правяралі ці не замініравана дарога, у ахове – БТР-ы і БМП. І раптам – выбух. Бачнасці ніякай, над калонай павісла хмара з пяску і дыму. Думаў, што пачаўся абстрэл, але аказалася, што машына, якая ішла прама перад маёй, уз'ехала на міну. І гэта пасля праверкі сапераў і пасля таго, як па дарозе праехалі дзясяткі калёс. Параненага вадзіцеля адправілі на верталёце ў шпіталь, самі паехалі далей. Небяспечна было ехаць па дарозе праз Мармольскую цясніну. Вузкая дарога працягам 11 кіламетраў серпанцінам выкручвалася паміж гор, ішла на пад'ём, а знізу – прорва, куды можна было зваліцца, зрабіўшы хоць адзін няправільны рух. Яшчэ адна небяспека – горы, якія «страляюць» а мы ўнізе, як на далоні – выдатная мішэнь для душманаў, – гаворыць Андрэй Сцяпанавіч. – Адзін раз на месяц засталіся ў кішлаку Марм оль. Жылі ў цясніне паміж скал, ацяпляліся самаробнай печкай па-чорнаму, бо ў ёй нават трубы не было. Пастаянна пакутвалі ад смагі: пілі ваду з растопленага снегу і сырую – з мясцовых рэк. Для дэзынфекцыі кіпень заварвалі з вярблюджымі калючкамі, але гэта не надта памагала –

распаўсюджанымі былі рознага роду кішэчныя інфекцыі і гепатыт. Але для нас яны былі не такія страшныя, як кулі душманаў. Небяспека была заўсёды побач: падземныя хады-«калодзежы» з якіх вялі абстрэл душманы; мясцовыя жыхары, якія вазілі пад хворастам зброю і маглі прымяніць яе ў любы момант; звычайная знойдзеная запальнічка раптоўна ўзрывалася ў руках; міны з пластыкавым верхам, расстаўленыя на горных перавалах і сцяжынках, якія не маглі ўнюхаць сабакі. Аднойчы пад пярэднімі коламі ГАЗ-66 узарвалася міна, і ў адно імгненне вадзіцель, нядаўна здаровы чалавек, ператварыўся ў калеку. У адзін з майскіх дзён сапёры мотаманеўровай групы Тэрмезскага пагранатрада трапілі ў засаду. Кровапраліцця пазбегнуць не ўдалося: з васьмі пагранічнікаў **(на здымку)** толькі двое засталіся жывымі. «Груз 200» для нас тады быў не міфам, а рэальнасцю, ад якой ніхто не застрахаваны. Пасля ўсяго бачанага і чутага я не думаў, што вярнуся з Афгана жывым. Днём і ноччу быў адзін на адзін са сваімі думкамі, бо бацькам аб тым, што бачыў, не напішаш – пісьмы праходзілі строгую цэнзуру. Але мама ўсё адчувала. Яе малітва і вера не далі майму жыццю стаць прахам на чужой зямлі і вярнулі на радзіму. Ведаю, колькі слёз праліла начамі, мяне чакаючы, таму, каб яе лішні раз не хваляваць, я нават ад водпуску адмовіўся.

За гады службы Андрэй Латушка «пераплываў» на сваім ЗІЛе праз раку Пяндж – дастаўляў груз у манеўровыя групы Пянджанскага і Маскоўскага пагранічных атрадаў. Далёкая, на 200–350 кіламетраў ад мяжы, праз Кундуз у Талукан, дарога пужала не сваімі кіламетрамі, а невядомасцю і адсутнасцю ўпэўненасці ў тым, што не кінецца пад колы ці не зляціць са скал кулямётная смяротная небяспека.

– Гады службы ў Афганістане далі магчымасць пабываць, можна сказаць, у музеі XIII стагоддзя, пазнаёміцца з чужым укладам жыцця і традыцыямі, загартавалі дух і цела, умацавалі веру ў Божы лёс, паказалі сілу сяброўства і салдацкай узаемавыручкі і навучылі цаніць жыццё, – кажа Андрэй Сцяпанавіч.

## УЗНАГАРОДА ПРЫЙШЛА СЛЕДАМ

У лютым 1988 года Андрэй Латушка вярнуўся ў родную Забалаць. Грамату Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «за мужнасць і воінскую доблесць, праяўленыя пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Рэспубліцы Афганістан» за подпісам Генеральнага сакратара М. Гарбачова, яму ўручылі ў мясцовым ваенкамаце. Яе разам з білетамі на цягнік, часопісам «Пагранічнік» і пажаўцелымі здымкамі ў дэмбельскім альбоме Андрэй Сцяпанавіч захоўвае да цяперашняга, як каштоўную рэліквію.

Пасля арміі Андрэй Сцяпанавіч дзесяць гадоў працаваў кранаўшчыком у ПМК Воранаўскага раёна, затым перайшоў у Дэпартамент аховы. Час ад часу гасцяваў у роднай цёці ў Глыбокім. У адзін з такіх прыездаў пазнаёміўся з Зінай. Ажаніўся. Вось ужо дваццаць гадоў, як ён – глыбачанін. Завочна скончыў Мінскі дзяржаўны энергетычны каледж, працуе інжынерам Глыбоцкага аддзялення «Энергазбыт» РУП «Віцебскэнерга». Разам з жонкай выхавалі дачку Надзею, якая вучыцца ў Мінскім лінгвістычным універсітэце на перакладчыка.

Прайшоўшы дарогамі вайны, Андрэй Сцяпанавіч перакананы, што самае большае шчасце ў жыцці – гэта дні і ночы без стральбы і ўзрываў. Ну а ўжо пад мірным небам можна цешыцца юнацтвам дачкі, радавацца яе студэнцкім поспехам, чакаць зяця і рыхтавацца да статуса дзядулі.

– Я за тое, каб «ваенныя баталіі» вяліся толькі на ўзроўні дыпламатыі і заканчваліся мудрым і правільным рашэннем: засцерагчы і зберагчы жыццё: людзей ад знішчэння, – гэтыя словы майго суразмоўцы і ёсць тая стальная цытадэль, якую не павінны зрушыць ні час, ні воля палітыкаў.



2016 год. Навабранец Андрэй Латушка (справа).



Пагранічнікі з мясцовай дзетварой.




Андрэй Латушка (стаіць справа) з сябрамі па аўтароце.

**Галіна СУТУЛА**
**Фота з архіва А. ЛАТУШКА**